ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспубліка Беларусь
28.08.2019 № 144

# Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Літаратурнае чытанне» для III–V класаў першага аддзялення дапаможнай школы (дапаможнай школы-інтэрната) з беларускай мовай навучання

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Мастацкае слова з'яўляецца магутным сродкам фарміравання асобы, выхавання грамадзянскай і духоўнай культуры чалавека. Кніга традыцыйна дапамагае пазнанню, фарміраванню светапогляду, пашырэнню кругагляду, дае магчымасць стаць цікавым суразмоўцам. Вучэбны прадмет «Літаратурнае чытанне» прызначаны ўвесці ў свет мастацкай літаратуры, заахвоціць да чытання кніг, закласці асновы чытацкай культуры і чытацкай самастойнасці. На ўроках літаратурнага чытання ажыццяўляецца работа з дзіцячай кнігай, адбываецца авалоданне навыкамі чытання і першапачатковымі чытацкімі ўменням.

Вучэбная праграма па вучэбнаму прадмету «Літаратурнае чытанне» (далей – вучэбная праграма) накіравана на актывізацыю зносін на беларускай мове гэтай катэгорыі навучэнцаў і з'яўляецца адной з крыніц набыцця імі вітагенных ведаў, якія дапамагаюць фарміраванню жыццяздольнай асобы.

Урокі літаратурнага чытання ў III–V класах першага аддзялення дапаможнай школы (дапаможнай школы-інтэрната) (далей – дапаможная школа) не з'яўляюцца прапедэўтыкай літаратурнай адукацыі. Іх аснову складае фарміраванне ўмення правільна, асэнсавана і выразна чытаць невялікія па аб'ёме мастацкія творы, авалоданне навыкамі і ўменнямі элементарнага аналізу твора, характараў дзейных асоб, іх учынкаў. Пры выбары зместу навучання ўвага звяртаецца на мастацка-эстэтычную каштоўнасць твораў, іх адпаведнасць узростава-псіхалагічным асаблівасцям і магчымасцям дзяцей з лёгкай інтэлектуальнай недастатковасцю, карыснасць для працэсу іх сацыяльнага і сацыяльна-эмацыянальнага развіцця, што непасрэдна ўплывае на характар сацыялізацыі і сацыяльнай адаптацыі навучэнцаў. Яшчэ адным крытэрыем з'яўляецца нацыянальна-культурная адметнасць матэрыялу. Асаблівасці пазнавальнай дзейнасці ў цэлым, і маўлення ў прыватнасці, характэрныя для навучэнцаў дапаможнай школы, абумоўліваюць элементарна-практычны характар іх навучання.

Навучанне літаратурнаму чытанню грунтуецца на наступных тэарэтычных падыходах:

мульцікультурным (увядзенне навучэнца ў свет нацыянальнай культуры ў адзінстве з агульначалавечымі каштоўнасцямі);

кампетэнтнасным (авалоданне абагульненымі спосабамі дзейнасці на падставе вітагенных ведаў);

дыферэнцыраваным (улік пазнавальных магчымасцей, прыроды інтэлектуальнай недастатковасці).

Канцэптуальнымі палажэннямі вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» з'яўляюцца:

практыка-арыентаваны характар навучання, накіраваны на фарміраванне жыццяздольнай, падрыхтаванай да самастойнага жыцця асобы;

карэкцыйная накіраванасць навучання, якая прасочваецца ў карэкцыі не толькі фанетыка-фанематычнага і лексіка-граматычнага бакоў маўлення, але і асобы ў цэлым.

Прынцыпы навучання літаратурнаму чытанню:

улік псіхалагічных асаблівасцей успрымання мастацкай літаратуры навучэнцамі;

практычная накіраванасць зместу навучання і карысць для сацыяльна-эмацыянальнага развіцця;

улік асаблівасцей пазнавальнай дзейнасці;

карэкцыйная накіраванасць навучання.

**Мэта** вучэбнага прадмета – фарміраванне культурнага і свядомага чытача, які валодае навыкамі чытання, арыентаванага на ўзбагачэнне сацыяльнага вопыту і паспяховую інтэграцыю ў грамадстве.

Рэалізацыя мэты прадугледжвае рашэнне шэрага **задач**:

развіццё цікавасці да чытання і выхаванне любові да кнігі як крыніцы ведаў;

навучанне правільнаму, усвядомленаму, выразнаму чытанню ўголас і моўчкі (сам сабе);

фарміраванне элементарных чытацкіх уменняў і абагульненых спосабаў вучэбнай дзейнасці;

развіццё і карэкцыя пазнавальных працэсаў, маўлення і асобы дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю;

выхаванне грамадзянскіх і маральна-этычных якасцей асобы і садзейнічанне сацыяльнай адаптацыі навучэнцаў шляхам арыентацыі зместу навучання на пашырэнне і паглыбленне ведаў аб навакольным свеце і засваенне сацыяльнага вопыту.

Сістэматычнае навучанне літаратурнаму чытанню пачынаецца пасля навучання грамаце. У I–II класах навучэнцы знаёмяцца з алфавітам, гукамі роднай мовы, вучацца чытаць склады розных відаў і выпрацоўваюць механізм пераходу ад чытання па складах да чытання ўголас цэлымі словамі. На заключным этапе навучання грамаце адпрацоўваецца навык інтанацыйна аб’ядноўваць словы ў словазлучэнні і сказы.

У III класе працягваецца выпрацоўка ўмення чытаць уголас цэлымі словамі простых слоў і складовае чытанне шматскладовых слоў. У залежнасці ад індывідуальных магчымасцей паступова паскараецца тэмп чытання. Пры чытанні ўголас увага звяртаецца на ўдасканаленне гукавымаўлення, прасодыкі, на эмацыянальны характар твора. Аўдзіраванне застаецца абавязковым відам маўленчай дзейнасці, бо ўспрыманне тэкстаў на слых дазваляе арганізаваць работу па развіцці слоўна-лагічнага мыслення навучэнцаў і слыхавога ўспрымання, а таксама дае ўзор правільнага літаратурнага маўлення. Пераход да чытання моўчкі (сам сабе) звязаны з удасканаленнем тэхнікі чытання.

У IV–V класах удасканальваецца навык свядомага чытання цэлымі словамі ўголас, выпрацоўваецца ўменне чытаць сам сабе. Працягваецца навучанне элементарнаму аналізу мастацкага твора.

Структура дадзенай вучэбнай праграмы змяшчае раздзелы «Прыкладная тэматыка чытання», «Чытанне», «Чытацкія ўменні», «Пазакласнае чытанне», «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў».

**«Прыкладная тэматыка чытання»** ўключае прыкладны пералік тэм для чытання (раздзелы вучэбнага дапаможніка). Колькасць гадзін, прыведзеная ў дужках, таксама з’яўляецца прыкладнай.

Раздзел **«Чытанне»** змяшчае віды і спосабы чытання, якасныя кампаненты чытання (правільнасць, усвядомленасць, выразнасць, бегласць).

Раздзел **«Чытацкія ўменні»** ўключае пералік уменняў, якімі авалодваюць дзеці з інтэлектуальнай недастатковасцю ў працэсе практычнай работы над мастацкімі творамі. Сярод іх:

уменне арыентавацца ў змесце твора;

уменне вызначаць паслядоўнасць падзей;

уменне ацэньваць характары і ўчынкі дзейных асоб;

уменне вылучаць у творах словы, сказы, урыўкі, якія апісваюць герояў;

уменне вызначаць асноўную думку твора.

Навучэнцы вучацца адказваць на пытанні па змесце твора, пераказваць яго па пытаннях педагагічнага работніка, малюнку ці серыі малюнкаў (3–4 сказы), адгадваюць загадкі, тлумачаць з дапамогай педагагічнага работніка сэнс прыказак і прымавак,

завучваюць на памяць загадкі, прымаўкі, прыказкі, песенькі, пацешкі, лічылкі, вершы і ўзнаўляюць іх з адпаведнай інтанацыяй.

Для чытання ў III–V класах дапаможнай школы выкарыстоўваюцца творы вуснай народнай творчасці, творы (ці ўрыўкі, асобныя часткі, слупкі з іх) беларускіх пісьменнікаў і замежных пісьменнікаў у перакладзе на беларускую мову, даступныя для ўспрымання і разумення дзяцьмі з інтэлектуальнай недастатковасцю. Навучэнцы знаёмяцца з творамі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Кандрата Крапівы, Васіля Віткі, Артура Вольскага, Максіма Танка, Янкі Брыля, Алеся Якімовіча, Авяр'яна Дзеружынскага, Змітрака Бядулі, Васіля Жуковіча, Уладзіміра Ягоўдзіка, Васіля Хомчанкі і інш.

Прапанаваныя ў вучэбным дапаможніку творы арыентуюць педагагічнага работніка на змест навучання. Аднак кантынгент класа дапаможнай школы традыцыйна з'яўляецца неаднародным па характары і ступені сэнсорнага, моўнага і інтэлектуальнага недаразвіцця, і навучэнцы ў працэсе навучання чытанню аказваюцца на розных этапах авалодання гэтым навыкам. У сувязі з гэтым педагагічны работнік можа замяняць прапанаваныя вучэбным дапаможнікам творы на больш даступныя для ўзроўню навучэнцаў.

Неад'емнай часткай вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» з'яўляецца пазакласнае чытанне.

**Мэта** пазакласнага чытання – знаёміць навучэнцаў з дзіцячай літаратурай, адпаведнай узросту, выхоўваць цікавасць да працэсу чытання і патрэбу ў самастойным чытанні.

Пазакласнае чытанне прапануецца пачынаць з другога паўгоддзя II класа. Аднак ужо ў I класе і ў першым паўгоддзі II класа навучэнцы знаёмяцца з кнігай на аснове разгляду і чытання педагагічным работнікам (слуханне). Гэта могуць быць невялікія кнігі для дзяцей дашкольнага ўзросту, кніжкі-маляванкі з серыі «Мая першая кніжка». Падбіраюцца кнігі з невялікім тэкставым кампанентам (каб захапіць і ўтрымаць увагу навучэнцаў), са зразумелым зместам, рэалістычнымі малюнкамі, з буйным шрыфтам і тыповым афармленнем (на першай старонцы прозвішча аўтара, загаловак, малюнак), з невялікім аб'ёмам старонак. Гэты этап можна лічыць **падрыхтоўчым**. Асноўныя віды дзейнасці навучэнцаў – слуханне і разглядванне дзіцячых кніг.

Другое паўгоддзе II класа – **пачатковы** этап пазакласнага чытання. Навучэнцы пад кіраўніцтвам педагагічнага работніка разглядваюць кнігі, па магчымасці знаходзяць прозвішча аўтара і назву кнігі, спрабуюць самастойна іх прачытаць. Прапануюцца невялікія па аб'ёме дзіцячыя кнігі з прыгожымі ілюстрацыямі. Шырока выкарыстоўваецца ўспрыманне тэксту на слых (слуханне). Педагагічны работнік чытае ўслых з адпаведнай інтанацыяй народныя і аўтарскія творы (казкі, апавяданні, дзіцячыя вершы і песні, прыказкі, прымаўкі) аб гульнях і забавах дзяцей, аб жывёлах і раслінах, прыгодах і чарадзействе, аб Радзіме, працы дарослых і інш. Навучэнцы асэнсоўваюць паняцці: кніга, назва кнігі, аўтар кнігі, вокладка, старонка.

III–V класы – **асноўны** этап. Пазакласнае чытанне праводзіцца адзін раз на месяц. Навучэнцы разглядаюць і чытаюць самастойна прыгожа аздобленыя кнігі аб'ёмам ад 8–12 старонак і дзіцячыя перыядычныя выданні (часопісы «Вясёлка», «Буся», «Бярозка» і інш.). У працэсе работы з кнігай навучэнцы засвойваюць знешнія прыметы кнігі (вокладка, старонка, назва на вокладцы) і асэнсоўваюць паняцці *твор, загаловак твора, прозвішча аўтара, змест* і інш.), замацоўваюць правілы гігіены чытання і вучацца беражліва ставіцца да кніг. Таксама навучэнцы набываюць шэраг уменняў і навыкаў, сярод якіх самастойнае чытанне кнігі, выбар кнігі ў адпаведнасці з інструкцыяй педагагічнага работніка, вызначэнне прыкладнага зместу кнігі па назве, ілюстрацыях.

Для пазакласнага чытання педагагічны работнік падбірае кнігі, якія супадаюць па тэматыцы з тымі творамі, што вывучаюцца на ўроках. Навучэнцам прапануюцца такія тэксты, якія адпавядаюць іх чытацкім магчымасцям, могуць зацікавіць і быць карыснымі для фарміравання асобы. Для зручнасці арыентуюцца на фонды бібліятэкі ўстановы адукацыі.

Усе раздзелы дадзенай вучэбнай праграмы аб'ядноўвае прынцып развіцця маўлення.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

### III клас

102 гадзіны (у тым ліку 9 гадзін – пазакласнае чытанне)

### ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ЧЫТАННЯ

Невялікія па аб'ёме творы вуснай народнай творчасці: прыказкі, казкі, скорагаворкі, пацешкі, песні, загадкі. Адаптаваныя мастацкія творы (асобныя часткі, урыўкі) пра восень, зіму, вясну, лета, невялікія апавяданні і вершы (ці ўрыўкі з іх) пра жыццё, сяброўства, справы і клопаты дзяцей, тэксты пра маці, сям'ю і інш.

Прыкладныя раздзелы:

**1. Званок вясёлы дзяцей склікае ў школу (14 гадзін)**[1]

*А. Вольскі*. «У верасні», «Коцева грамата».

*С. Панізнік*. «Верасень».

*С. Шушкевіч*. «Дружны клас».

*В. Жуковіч*. «Ідзе вучаніца».

*Т. Мушынская*. «Чаму плакалі кніжкі?».

*А. Русак*. «Мой сябра».

*В. Клышка*. «Памылілася», «Жабчыны словы».

*Л. Дайнека*. «Беражыце сшыткі, кніжкі».

*В. Ткачоў*. «Дыктант».

*К. Камейша*. «Задача».

*Н. Парукаў*. «Над партамі вучні…».

*П. Рунец*. «Не хацеў хваліцца».

*У. Ліпскі*. «Шарачок на шашы» (казка).

*Т. Кляшторная*. «Ветлівыя словы».

*В. Хомчанка*. «Крыўда».

*М. Пазнякоў*. «Сяргей».

Пазакласнае чытанне. Чытанне-разглядванне дзіцячых кніг і часопісаў для дзяцей[2].

---

[1] Размеркаванне гадзін паміж раздзеламі з'яўляецца прыкладным.

[2] Месца ўрока пазакласнага чытання ў раздзеле вызначае педагагічны работнік. Чытанне-разглядванне дзіцячых кніг і часопісаў прапануецца вучням на ўсіх уроках пазакласнага чытання (пры наяўнасці часу).

Прыказкі, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*Максім Танк, М. Пазнякоў, Н. Галіноўская, А. Клышка, А. Александровіч, А. Зэкаў, І. Муравейка, Н. Парукаў* і інш.).

**2. Восень! Цябе мы ў госці просім! (16 гадзін)**

*Г. Каржанеўская*. «Песенька».

*А. Дзеружынскі*. «Верасень», «Смачны горад», «Бульба».

*С. Шушкевіч*. «Сыплюць лісцікі бярозы».

*У. Юрэвіч*. «Шумны лістапад».

*Вера Вярба*. «Восень».

*М. Даніленка*. «Восень шыла сарафан».

*Т. Мушынская*. «Як Дзяніска восені дапамагаў».

*М. Чарняўскі*. «Павучковыя арэлі».

*Р. Ігнаценка*. «Лістапад у лесе».

*П. Пранузa*. «Смачны сняданак».

*Эдзі Агняцвет*. «Антонаўка».

*Я. Галубовіч*. «Жураўлі адлятаюць не адны», «Вожык».

*А. Пысін*. «Хто галосіць на паляне?».

*П. Пранузa*. «Грыбнік».

*А. Якімовіч.* «Чаму хмаркі плачуць?» (казка).

*З. Бяспалы.* «Хітры падасінавік», «Русачок і Белячок» (урывак пра восень).

Пазакласнае чытанне. *Я. Галубовіч.* «Зайкаў садок»[3].

[3] Педагагічны работнік можа прапанаваць навучэнцам іншыя творы для пазакласнага чытання.

Прыказкі, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*В. Жуковіч, М. Пазнякоў, А. Клышка, В. Вольскі, А. Масла, А. Зэкаў* і інш.).

**3. Добра ў роднай хаце! (15 гадзін)**

*В. Лукша.* «Мы – працоўная сям'я…».

*В. Жуковіч.* «Сям'я», «Дзве бабулечкі ў мяне».

*В. Хомчанка.* «Мама», «Гузік».

*І. Муравейка.* «Добра з мамай», «Адно яечка на дваіх».

*Эдзі Агняцвет.* «Маме», «Я сама».

*Н. Галіноўская.* «Бабуліна песня».

*Б. Сачанка.* «Бабка Адарка».

*М. Маляўка.* «Стол».

*Ю. Свірка.* «Свята».

*М. Пазнякоў.* «Васількова дарога».

*Л. Шырын.* «Мой тата».

*Д. Слаўковіч.* «Разумны аловак».

*М. Янчанка.* «Хлебныя крошкі».

*А. Дзеружынскі.* «Маленькая памочніца».

*Я. Радкевіч.* «Хто самы моцны?».

*В. Ткачоў.* «Дзядулева тайна».

*У. Паўлаў.* «Брацік».

*П. Рунец.* «Перастараўся».

Пазакласнае чытанне. *В. Хомчанка.* «Яблык».

Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*В. Кудлачоў, С. Кацуба, А. Клышка, У. Карызна, Т. Булатава, К. Карнялюк, В. Трусевіч* і інш.).

**4. Ой, зіма, зіма, зіма! Весялей, чым ты, няма! (5 гадзін)**

*Ю. Свірка.* «З першым снегам».

*С. Шушкевіч.* «Усё зіма заснежыла».

*Якуб Колас.* «Зімнія халады».

*Т. Мушынская.* «Размова сняжынак».

*П. Ткачоў.* «Пад Новы год».

*Р. Бензярук.* «Лясная госця».

*Х. Жычка.* «Хутка свята».

*В. Зуёнак.* «Са Снягуркай».

*Кандрат Крапіва.* «З Новым годам».

*М. Бусько.* «На зімовых канікулах».

Прыказкі, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*М. Лужанін, У. Мацвеенка, Д. Бічэль, М. Чарняўскі, М. Сівец, А. Клышка* і інш.).

**5. Не баімся мы марозу і мяцеліцы! (10 гадзін)**

*Д. Бічэль.* «Зіма», «Мае канькі».

*М. Маляўка.* «Госця», «Лыжнік».

*Я. Бяганская.* «Сапраўдныя сябры».

*П. Прануза.* «На лыжах».

*М. Пазнякоў.* «На горцы».

*М. Даніленка.* «Зімовая азбука».

*Т. Мушынская.* «Ветлівая сінічка».

*С. Шушкевіч.* «Нашы сябры».

*А. Дзеружынскі.* «Кармушкі».

*М. Пазнякоў*. «Зайчык».

*Клаўдзія Каліна*. «Люты».

*Р. Бензярук*. «Люты і дзеці».

Пазакласнае чытанне. *З. Бяспалы*. «Русачок і Белячок» (урывак пра зіму).

Прыказкі, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*М. Лужанін, У. Мацвеенка, Д. Бічэль, М. Чарняўскі, М. Сівец, А. Клышка* і інш.).

**6. Жывёлы – нашы сябры! (14 гадзін)**

*А. Клышка*. «Каго як завуць?».

*А. Васілевіч*. «Мая гаспадарка».

*Н. Галіноўская*. «Жарт», «За качкай ходзяць...».

*Якуб Колас*. «Храбры певень».

*У. Ліпскі*. «Гусак», «Машына мова і дзедава замова».

*Т. Кляшторная*. «Злодзей».

*І. Муравейка*. «Бурачок і бычок».

*А. Вольскі*. «Безбілетная падарожніца».

*М. Пазнякоў*. «Дамок для Рэкса».

*А. Жаўрук*. «Каток».

*Я. Хвалей*. «Што за інтэрнат?».

*А. Дзеружынскі*. «Хто пра што», «Рагуля-малакуля», «Воўк і ліска» (казка).

*В. Вольскі*. «Гаспадар пушчы».

*У. Караткевіч*. «Белавежа».

Пазакласнае чытанне. «Коцік, пеўнік і лісіца» (беларуская народная казка). «Як курачка пеўніка ратавала» (беларуская народная казка).

Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*П. Саковіч, М. Чарняўскі, Х. Ляшкевіч, Н. Галіноўская, А. Клышка, А. Якімовіч, Янка Журба, В. Жуковіч* і інш.).

**7. Пачынаецца вясна з мамінага свята! (16 гадзін)**

*П. Пранузa*. «Ажылі пралескі», «Маміны рукі».

*В. Кастручын*. «Вясна ідзе».

*А. Вольскі*. «Маміна свята», «Пчала», «Май».

*Т. Кляшторная*. «Шпак».

*Якуб Колас*. «Прылёт птушак», «Мурашкі».

*Янка Журба*. «Шпак».

*Вера Вярба*. «Пралеска».

*П. Ткачоў*. «Зямля прачынаецца».

*Л. Шырын*. «Песня ручая».

*М. Маляўка*. «Каб вясна хутчэй настала».

*Васіль Вітка*. «Вясновыя гукі».

*А. Дзеружынскі*. «Клекатун», «Сустрэча сяброў».

*А. Зэкаў*. «Казёл і капуста».

*М. Пазнякоў*. «Садзім алею».

*В. Ткачоў*. «На здароўе, сонейка».

*Міхась Чарот*. «Вясенняя раніца».

*К. Жук*. «Май».

*З. Бяспалы*. «Русачок і Белячок» (урывак пра вясну).

Пазакласнае чытанне. *Я. Галубовіч*. «Вожык і ручаёк» (казка) (*А. Дзеружынскі*. «Птушыныя напевы», «Пчолы і кветкі» (казка)).

Прыказкі, смяшынкі, прыметы, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*В. Жуковіч, У. Мацвеенка, Р. Барадулін, М. Чарняўскі, Н. Гілевіч, А. Зэкаў* і інш.).

**8. Добра ўсім жывецца ўлетку! (12 гадзін)**

*Д. Бічэль*. «Лета».

*Якуб Колас*. «Лета».

*В. Вольскі*. «Чэрвень», «Ліпень», «Жнівень», «Купалле» (з народнай песні).

*С. Кухараў*. «Каласавічок».

*Канстанцыя Буйло*. «Рэха».

*Р. Барадулін*. «Загадкі на градках».

*Эдзі Агняцвет*. «На гародзе рос гарох».

*У. Паўлаў*. «Перад дажджом».

*А. Дзеружынскі*. «Па былінках…», «Летняя раніца».

*В. Хомчанка*. «Лівень».

*М. Пазнякоў*. «Па ягады».

*П. Сушко*. «Па арэхі», «Мне мілей за ўсё...».

*І. Муравейка*. «Сонца».

*П. Ткачоў*. «Ціхая мясціна».

*П. Броўка*. «Летам».

Пазакласнае чытанне. «Пра што кукуе зязюля?» (беларуская народная казка) (*В. Сухамлінскі*. «Дожджык і Гром» (казка)).

Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*Якуб Колас, Максім Танк, А. Вольскі, В. Вольскі, В. Хомчанка, В. Жуковіч, Р. Барадулін, У. Мацвеенка, Н. Парукаў, А. Пысін, К. Карнялюк* і інш.).

## ЧЫТАННЕ

**Спосаб чытання.** Чытанне услых слоў з аднаго-двух складоў цэлымі словамі. Чытанне трох-, чатырохскладовых слоў па складах з паступовым пераходам да чытання цэлымі словамі.

**Правільнае чытанне.** Станаўленне механізму чытання. Правільнае, без скажэння гукавога саставу, чытанне кароткіх слоў і шматскладовых па складах. Дакладнае вымаўленне гукаў і складоў усіх відаў. Правільная пастаноўка націску.

**Свядомае чытанне.** Усвядомленае чытанне кароткіх слоў і шматскладовых (па складах) слоў. Вызначэнне, пра каго або пра што гаворыцца ў прачытаным сказе, тэксце (адказ на пытанні па змесце); разуменне паслядоўнасці падзей, учынкаў герояў. Выбар слова, сказа, якія адпавядаюць ілюстрацыі, і знаходжанне ілюстрацыі, якая адпавядае сказу, урыўку. Знаходжанне і чытанне пэўнага слова, выразу ці сказа (выбарачнае чытанне). Падбор загалоўка да тэксту. Засваенне спосабаў завучвання на памяць невялікіх вершаў з голасу педагагічнага работніка (па апорных словах, малюнках).

**Выразнае чытанне.** Авалоданне сродкамі выразнага чытання: захаванне паўз, інтанацыі канца сказа. Чытанне са змяненнем сілы голасу (гучна, ціха). Выразнае чытанне на памяць вершаў, пацешак і інш.

Хуткасць чытання павялічваецца ў адпаведнасці з індывідуальнымі магчымасцямі навучэнцаў.

## ЧЫТАЦКІЯ ЎМЕННІ

Навучэнцы авалодваюць наступнымі ўменнямі:

слухаць і разумець сэнс невялікіх мастацкіх твораў (казкі, загадкі, вершы, прыказкі і г.д.);

чытаць невялікія тэксты (спосаб чытання адпавядае магчымасцям);

эмацыянальна рэагаваць на пачутае ці прачытанае;

вызначаць дзейных асоб твора (галоўных герояў), асноўныя рысы іх характараў;

знаходзіць і тлумачыць з дапамогай педагагічнага работніка загаловак твора (назву);

выказваць уласныя адносіны да дзейных асоб і іх учынкаў (добры / дрэнны, правільна – няправільна, прыгожа – непрыгожа).

## ПАЗАКЛАСНАЕ ЧЫТАННЕ

Чытанне-разглядванне невялікіх, прыгожа ілюстраваных кніг для дзяцей дашкольнага ўзросту. Арыентацыя ў назве кнігі. Аўтар кнігі (пры наяўнасці). Арыентацыя

ў змесце. Знаходжанне ў кнізе радкоў, якія адпавядаюць малюнку, і наадварот. Чытанне-разглядванне ілюстраваных часопісаў для дзяцей.

Знаёмства з правіламі гігіены чытання і беражлівага стаўлення да кніг (часопісаў).

Навучэнцы вучацца выбіраць знаёмую кнігу сярод іншых па інструкцыі педагагічнага работніка; разглядваць і па магчымасці чытаць кнігу ці асобны твор самастойна; вызначаць, пра што (каго) будзе ісці размова ў кнізе (творы) па назве, ілюстрацыях.

**Кола чытання.** Прыгожа ілюстраваныя дзіцячыя кнігі (часопісы) з тыповым афармленнем вокладкі аб’ёмам прыкладна 8–16 старонак (казкі, вершы, смяшынкі, загадкі для дзяцей, кніжкі серыі «Мая першая кніжка», часопісы «Вясёлка», «Буся», «Бярозка» і інш.).

**Тэматыка чытання** суадносіцца з тэматыкай урокаў чытання.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

*Навучэнцы ведаюць і разумеюць:*

сэнс пачутага ці прачытанага;

на памяць 3-4 кароткія вершы (загадкі, лічылкі);

правілы гігіены чытання і неабходнасць беражліва ставіцца да кніг.

*Навучэнцы ўмеюць:*

слухаць невялікія па аб’ёме творы (казку, верш, апавяданне і інш.);

асэнсавана чытаць уголас па складах і цэлымі словамі (камбінавана) невялікія тэксты з захаваннем інтанацыі канца сказа і паўз;

адказваць на пытанні па фактычным змесце тэксту;

вызначаць галоўных дзейных асоб твора, асноўныя рысы іх характараў;

знаходзіць у тэксце радкі, якія адпавядаюць ілюстрацыі;

аднаўляць змест прачытанага (тэкст ці яго частку) па пытаннях педагагічнага работніка ці малюнках;

эмацыянальна рэагаваць на пачутае ці прачытанае;

выразна чытаць перад класам вывучаныя на памяць вершы, загадкі і г.д.;

знаходзіць і тлумачыць з дапамогай педагагічнага работніка загаловак твора (назву кнігі).

*Навучэнцы выкарыстоўваюць набытыя веды і ўменні ў штодзённых зносінах і практычнай дзейнасці:*

падтрымліваюць размову на зразумелую тэму, па магчымасці правільна вымаўляючы гукі роднай мовы (2–3 сказы);

расказваюць пра падзеі з уласнага жыцця (2–3 сказы).

## IV КЛАС

105 гадзін (у тым ліку 9 гадзін – пазакласнае чытанне)

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ЧЫТАННЯ

Творы вуснай народнай творчасці (загадкі, прыказкі, прымаўкі, казкі і інш.), невялікія адаптаваныя апавяданні, вершы, артыкулы ў дзіцячых часопісах і газетах аб Радзіме, адносінах чалавека да працы, прыроды, мастацкія творы (ці часткі, урыўкі з іх) пра святы і знамянальныя даты, поры года, жыццё і справы дзяцей і дарослых, пра маці, сям’ю, сяброўства, пра жывёл і расліны, пра этыку паводзін і інш.

Прыкладныя раздзелы:

**1. Радасна ў школе нам вучыцца і сябраваць (10 гадзін)**[4]

[4] Размеркаванне гадзін паміж раздзеламі з’яўляецца прыкладным.

*М. Чарняўскі*. «Добры дзень, верасень!».

*М. Пазнякоў*. «Першага верасня».

*М. Дукса*. «Развітанне з летам», «Ці так чытала?».
*Я. Бяганская*. «Сябры», «Чаму пачырванеў Вадзік?».
*А. Александровіч*. «Наш дзень».
*А. Клышка*. «Крыўда алоўка».
*Д. Слаўковіч*. «Важнае пісьмо».
*У. Мацвеенка*. «Пятрок прызнаўся», «Тэлефон».
*Эдзі Агняцвет*. «Я добрую кнігу…».
*Ю. Свірка*. «Не рашаецца задача».
*П. Пранузa*. «Піша літару Марына».
*П. Рунец*. «Аднойчы вечарам».
*Р. Бензярук*. «Дружбакі» (казка).
Пазакласнае чытанне. Чытанне-разглядванне дзіцячых кніг і часопісаў для дзяцей[5].

[5] Месца ўрока пазакласнага чытання ў раздзеле вызначае педагагічны работнік.

Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*Н. Парукаў, Р. Яўсееў, Васіль Вітка, У. Мацвеенка, А. Пысін, М. Сліва* і інш.).

**2. Восень, восень залатая! Рады мы тваім дарам! (13 гадзін)**

*У. Дубоўка*. «Восень».
*С. Новік-Пяюн*. «Восень залатая».
*У. Ягоўдзік*. «Восень на парозе».
*М. Хведаровіч*. «Верасень».
*В. Вольскі*. «Вавёрка», «Бабіна лета».
*Я. Хвалей*. «Хто мастак?».
*Якуб Колас*. «Апошнія ясныя дні восені».
*С. Шушкевіч*. «Гусанькі».
*М. Лужанін*. «Восень».
*А. Ставер*. «У грыбах».
*Р. Ігнаценка*. «Пасадзіце рабінку».
*В. Зуёнак*. «Пень і апенькі».
*Клаўдзія Каліна*. «Як грыбы збіраліся на парад» (казка).
*В. Жуковіч*. «Маладая восень».
*Я. Крупенька*. «Рабінка».
*М. Пазнякоў*. «Позняя восень».
*Н. Галіноўская*. «Хутка зіма».
Пазакласнае чытанне. *А. Вольскі*. «Песенька цягніка» (*Н. Галіноўская*. «На прагулцы»)[6].

[6] Педагагічны работнік можа прапанаваць навучэнцам іншыя творы для пазакласнага чытання.

Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*В. Жуковіч, А. Салаўянчык, У. Мацвеенка, Н. Парукаў, А. Вольскі, К. Карнялюк* і інш.).

**3. Расці сапраўдным чалавекам (18 гадзін)**

*Васіль Вітка*. «Чатыры пажаданні», «Чарадзейныя словы».
*А. Пальчэўскі*. «Добрае слова».
*М. Янчанка*. «Дзякуй».
*А. Дзеружынскі*. «Дзякуй за ласку».
*Н. Галіноўская*. «Ветлівы свавольнік», «Дзякуй, чалавек!».
*А. Пісьмянкоў*. «Шчодры певень».
*Д. Слаўковіч*. «Настачка».
*М. Пазнякоў*. «Хітры Іванка», «Мой дзядуля».
*Васіль Вітка*. «Тры пары».
*У. Ліпскі*. «Чароўныя словы» (казка-загадка).
*М. Хведаровіч*. «Уладзік».

*К. Хадасевіч-Лісавая*. «Вітаміны ад грыпу».
*М. Даніленка*. «Журка».
*І. Муравейка*. «Сапраўдны гаспадар».
*В. Хомчанка*. «Кручок».
*Эдзі Агняцвет*. «У спякоту...».
*В. Гарбук*. «Гульня».
*С. Панізнік*. «Дабрыня».
Пазакласнае чытанне. *А. Якімовіч*. «Вось дык суседзі!» (казка).
Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*У. Мацвеенка, Н. Галіноўская, Васіль Вітка, А. Зэкаў* і інш.).

**4. Зіма, зіма… У белым снезе ўся зямля (7 гадзін)**

*Д. Слаўковіч*. «А мы навошта?»
*В. Жуковіч*. «Зіма хадою смелаю…».
*Змітрок Бядуля*. «Сняжынкі».
*Якуб Колас*. «Зіма».
*Васіль Вітка*. «Чыя праўда?».
*М. Чарняўскі*. «Новы год».
*У. Мазго*. «Новы год».
*У. Мацвеенка*. «Цудоўная пара».
*К. Кірэенка*. «На санках».
Пазакласнае чытанне. *І. Муравейка*. «Для чаго снягір каляровы?»
Прыказкі, прыметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*Н. Парукаў, А. Салаўянчык, В. Жуковіч, У. Мацвеенка* і інш.).

**5. Ой, зіма, зіма, зіма! Весялей цябе няма! (16 гадзін)**

*П. Броўка*. «Зіма».
*В. Зуёнак*. «Студзень тупае ў двары…».
*В. Вольскі*. «Студзень».
*Эдзі Агняцвет*. «Снягі, снягі…».
*Н. Гілевіч*. «Снежны дзед».
*М. Даніленка*. «Як Петрык мароз напалохаў».
*Г. Іванова*. «Рукавічкі».
*А. Пысін*. «Пісьмо птушак».
*А. Салаўянчык*. «Вельмі цяжка пракарміцца…».
*М. Янчанка*. «Сталовая».
*А. Дзеружынскі*. «Амялушкі».
*Я. Галубовіч*. «Амялушкі на дзядоўніку».
*І. Муравейка*. «Петрусёк у дзень зімовы…».
*Р. Ігнаценка*. «Ноч у зімовым лесе».
*Янка Купала*. «Зімой у лесе».
*В. Лукша*. «Азбука на снезе».
*П. Ткачоў*. «Мікіткаў падарунак».
*П. Пранузa*. «У нашым садзе».
*Р. Ігнаценка*. «Цецерукі на бярозах».
Пазакласнае чытанне. *У. Мазго*. «Птушыная сталоўка», «Абаронцы».
Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*В. Жуковіч, М. Рудзішкін, В. Вольскі, В. Хомчанка* і інш.).

**6. Твая зямля, твая Радзіма названа светла – Беларусь (10 гадзін)**

*Р. Барадулін*. «Радзіма».
*Ю. Свірка*. «Твая Беларусь».
*В. Сухамлінскі*. «Цяпер я ведаю, якая Беларусь».
*М. Чарняўскі*. «Лён», «Бульба».
*М. Вышынскі*. «Міхедкаў лён».
*Якуб Колас*. «Слаўная рачушка».
*К. Буйло*. «Наш цягнік».

*В. Вольскі.* «Беларускае мора».

*В. Лукша.* «Белавежская пушча».

*М. Даніленка.* «Незвычайныя падарункі».

*С. Шушкевіч.* «Ідзе ўсюды пагалоска…».

*В. Ткачоў.* «Зямля з Хатыні».

*Н. Галіноўская.* «Родны бусел».

Пазакласнае чытанне. *М. Пазнякоў.* «Родная мова» (*М. Гіль.* «Мы бачым сонца», *Р. Бензярук.* «Шпак і Верабей» (казка)).

Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*У. Мазго, Н. Парукаў, Васіль Вітка, У. Мацвеенка, А. Зэкаў* і інш.).

**7. Праца патрэбна чалавеку як паветра, як вада, як хлеб (12 гадзін)**

*Змітрок Бядуля.* «Гаспадарка».

*Я. Янішчыц.* «Адкуль бярэцца хлеб?».

*К. Камейша.* «Духмянае дзіва».

*А. Дзеружынскі.* «З чым хлеб параўнаць?».

*Я. Хвалей.* «Урок працы».

*В. Кудлачоў.* «Дружная праца».

*В. Хомчанка.* «Наша лавачка».

*М. Даніленка.* «Стасікава кладка».

*Н. Галіноўская.* «Дапамогі просяць градкі».

*Я. Бяганская.* «Як Настачка маме дапамагала».

*М. Пазнякоў.* «Запрашаю».

*С. Шушкевіч.* «Агарод».

*Б. Сачанка.* «Насцечка».

*Васіль Вітка.* «Радасць».

*Р. Бензярук.* «Працавітыя і дружныя» (казка-загадка).

Пазакласнае чытанне. *Р. Бензярук.* «Будзень і Свята» (казка).

Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*Х. Ляшкевіч, А. Клышка, Васіль Вітка, К. Карнялюк* і інш.).

**8. Добры дзень, вясна-красна, як ты люба ўсім нам! (12 гадзін)**

*Клаўдзія Каліна.* «Фіялка», «Надыход вясны» (казка), «Красавік» (казка).

*Е. Лось.* «Ледзяшы».

*К. Цвірка.* «Вясна».

*В. Вольскі.* «Вясна».

*Вера Вярба.* «Пралеска».

*Р. Барадулін.* «Восьмы дзень сакавіка».

*А. Васілевіч.* «Маміна свята».

*В. Жуковіч.* «Мамачка».

*М. Хведаровіч.* «Дарагое імя».

*М. Пазнякоў.* «Шпачынае гняздо».

*Н. Гілевіч.* «Вітаю вясну».

*С. Шушкевіч.* «Красавік».

*А. Вольскі.* «Настрой у нас вясёлы».

*Змітрок Бядуля.* «Вясной».

Пазакласнае чытанне. *Цётка.* «Сварба» (*Клаўдзія Каліна.* «Красавік» (казка)).

Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*Н. Парукаў, В. Вольскі, В. Хомчанка, В. Жуковіч, У. Мацвеенка* і інш.).

**9. Цёплым сонейкам сагрэта прыйшло радаснае лета (7 гадзін)**

*М. Дукса.* «Развітаемся, званок!».

*Якуб Колас.* «На лузе», «У полі».

*Г. Аўласенка.* «Сыраежкі».

*А. Дзеружынскі.* «Грыбны дожджык».

*А. Жук.* «Хітрая гусь».

*В. Гардзей.* «Будзе дождж».

*Клаўдзія Каліна*. «Чэрвень і Сонейка».

*У. Мацвеенка*. «Цудоўная пара».

*У. Ягоўдзік*. «Суніцы».

Пазакласнае чытанне. Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*Н. Гілевіч, Васіль Вітка, А. Салаўянчык, А. Клышка, А. Зэкаў, Міхась Сліва* і інш.).

## ЧЫТАННЕ

**Спосаб чытання.** Чытанне цэлымі словамі. Паскладовае чытанне шматскладовых і цяжкіх для ўспрымання ці вымаўлення слоў. Замацаванне механізма чытання ўслых і выпрацоўка навыку чытання сам сабе.

**Правільнае чытанне.** Чытанне цэлых кароткіх слоў з захаваннем асноўных арфаэпічных нормаў і правільнай пастаноўкай націску (шматскладовых па складах). Арфаэпічна правільнае чытанне ўголас простага па змесце і невялікага па аб’ёме знаёмага і незнаёмага тэксту.

**Свядомае чытанне.** Усвядомленае чытанне ўголас невялікага па аб’ёме і простага па сюжэце тэксту (разуменне пра каго або пра што гаворыцца ў прачытаным тэксце, разуменне паслядоўнасці падзей, характару герояў і іх учынкаў). Эмацыянальная ацэнка тэксту. Аналіз назвы тэксту. Вызначэнне тэмы тэксту. Тлумачэнне слоў і выразаў з апорай на нагляднасць. Работа са слоўнікам, прапанаваным да тэксту. Знаходжанне ў тэксце частак вызначанай тэматыкі (апісанне героя, падзеі, стану прыроды). Працяг незакончанага апавядання па ілюстрацыях (2–3 сказы). Вывады па прачытаным тэксце, параўнанне прачытанага з уласным вопытам, са зместам раней прачытанага тэксту. Складанне апавядання па серыі малюнкаў.

**Выразнае чытанне.** Плаўнае чытанне з улікам інтанацыі, захаванне паўз на знаках прыпынку (кропка, коска, пытальнік, клічнік). Выразнае чытанне па ролях (дыялогі і невялікія сцэнкі з большай колькасцю асоб з прапанаваных для вывучэння твораў).

Выразнае чытанне на памяць вершаў, загадак і інш.

Хуткасць чытання павялічваецца ў адпаведнасці з індывідуальнымі магчымасцямі навучэнцаў.

## ЧЫТАЦКІЯ ЎМЕННІ

*Навучэнцы авалодваюць наступнымі ўменнямі:*

чытаць і разумець сэнс невялікіх мастацкіх твораў;

арыентавацца ў кнізе: знаходзіць назву, прозвішча аўтара, патрэбную старонку;

пераказваць прачытанае з дапамогай пытанняў педагагічнага работніка, ілюстрацый;

тлумачыць значэнне некаторых слоў, ужытых у тэксце;

вызначаць дзейных асоб твора (галоўных герояў);

характарызаваць герояў на падставе іх учынкаў і паводзін;

выказваць уласныя адносіны да падзей, герояў, іх учынкаў;

дзяліць тэкст на часткі з апорай на ілюстрацыі;

упарадкоўваць па ілюстрацыях дэфармаваны тэкст;

знаходзіць у тэксце ўрывак, які адпавядае ілюстрацыі.

## ПАЗАКЛАСНАЕ ЧЫТАННЕ

Разглядванне і чытанне невялікіх, прыгожа ілюстраваных кніг беларускіх пісьменнікаў для дзяцей (ці перакладзеных на беларускую мову). Арыентацыя ў назве кнігі і яе структуры (вокладка, тэкст, ілюстрацыі, змест, колькасць старонак). Аўтар кнігі (пры наяўнасці). Запіс назвы і аўтара твора. Арыентацыя ў змесце (па пытаннях і ілюстрацыях). Чытанне-разглядванне ілюстраваных часопісаў для дзяцей.

Замацаванне правілаў гігіены чытання і беражлівага стаўлення да кніг (часопісаў).

Навучэнцы працягваюць вучыцца выбіраць знаёмую кнігу сярод іншых па інструкцыі педагагічнага работніка. Чытаюць кнігу ці асобны твор услых самастойна, вызначаюць, пра што (каго) пойдзе размова ў кнізе (творы) па назве, ілюстрацыях.

**Кола чытання.** Прыгожа ілюстраваныя дзіцячыя кнігі з тыповым афармленнем вокладкі (прыкладна 12–20 старонак), часопісы для дзяцей («Вясёлка», «Буся», «Бярозка»).

**Тэматыка чытання** суадносіцца з тэматыкай урокаў літаратурнага чытання.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

*Навучэнцы ведаюць і разумеюць:*

сэнс прачытанага ўслых і сам сабе;

на памяць 4–5 кароткіх вершаў (загадкі, лічылкі і інш.);

назву і змест твора, які найбольш спадабаўся;

правілы гігіены чытання і неабходнасць беражліва ставіцца да кніг.

*Навучэнцы ўмеюць:*

правільна і свядома чытаць прапанаваны ў падручніку тэкст услых цэлымі словамі, цяжкія па структуры словы – па складах;

адказваць на пытанні да прачытанага;

вызначаць дзейных асоб твора (герояў), асноўныя рысы іх характараў;

выказваць уласныя адносіны да падзей, з'яў і ўчынкаў герояў;

знаходзіць і тлумачыць з дапамогай педагагічнага работніка загаловак твора (назву);

выразна чытаць на памяць перад класам (з захаваннем паўз і інтанацыі сказа);

выбіраць кнігі для пазакласнага чытання ў школьнай бібліятэцы.

*Навучэнцы выкарыстоўваюць набытыя веды і ўменні ў штодзённых зносінах і практычнай дзейнасці*:

падтрымліваюць размову на зразумелую тэму, звяртаючы ўвагу на правільнасць вымаўлення гукаў роднай мовы (3–4 сказы);

расказваюць пра падзеі з уласнага жыцця (3–4 сказы);

чытаюць друкаваны тэкст інфармацыйнага характару (расклад урокаў, аб'ява, запіска);

вядуць размову з захаваннем этыкі суразмоўніцтва.

## V КЛАС

105 гадзін (у тым ліку 9 гадзін – пазакласнае чытанне)

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ЧЫТАННЯ

Творы вуснай народнай творчасці (загадкі, прыказкі, прымаўкі, скорагаворкі, лічылкі, казкі і інш.). Невялікія па аб'ёме творы ці ўрыўкі з іх беларускіх і замежных аўтараў (творы класікаў і сучасных аўтараў). Апавяданні, вершы, навукова-папулярныя артыкулы ў часопісах для дзяцей пра Беларусь, адносіны чалавека да працы, прыроды, да сваіх блізкіх і іншых людзей. Мастацкія творы (адаптаваныя) пра народныя і дзяржаўныя святы і знамянальныя даты, поры года, жыццё, справы і адпачынак дзяцей і дарослых, пра жывёл і расліны, пра сяброўства, прыгоды, этыку паводзін і інш.

Прыкладныя раздзелы:

**1. За парты зноў паклікала званком прыветным школа (9 гадзін)**[7]

[7] Размеркаванне гадзін паміж раздзеламі з'яўляецца прыкладным.

*М. Чарняўскі*. «Пайшлі ад нас канікулы».

*А. Вольскі*. «Першы званок».

*Я. Журба*. «Раніцаю залацістай».

*В. Дукса*. «Запаведная крыніца».

*Н. Галіноўская*. «Жаданы госць», «Пчолкі падказалі».

*А. Жук*. «Урок».

*Н. Гілевіч*. «Калі ранец лёгкі і калі цяжкі?».

*М. Гіль*. «Татава аўтаручка».

*А. Масла*. «Як з'явіўся апостраф?», «Дзед Францiш і інтэрнэт».

*У. Ліпскі*. «Брат і сястра».

*Л. Шырын*. «Аж да вечара ад рання».

*В. Ткачоў*. «Мабільная выдатніца».

Пазакласнае чытанне. Чытанне-разглядванне дзіцячых кніг і часопісаў для дзяцей.

Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*У. Мацвеенка, Васіль Вітка, Л. Шырын, Я. Рызнік, Міхась Сліва, В. Жуковіч* і інш.).

**2. Восень крочыць па зямлі (17 гадзін)**

*П. Прыходзька*. «Восень».

*А. Дзеружынскі*. «У вырай».

*В. Гурскі*. «Развітальная песня».

*Г. Аўласенка*. «Клён».

*У. Мацвеенка*. «Гарачая пара».

*Р. Бензярук*. «Эх і яго браты» (казка).

*К. Кірэенка*. «Елачкі».

*М. Пазнякоў*. «Хітры зайка» (казка).

*Т. Мушынская*. «Ураджай».

*П. Місько*. «Добры чалавек», «Восеньскім днём».

*К. Жук*. «У бары».

*Г. Аўласенка*. «Прыгажун».

*М. Мятліцкі*. «Ясева просьба».

*Х. Чэрня*. «Сыраежкі».

*Клаўдзія Каліна*. «Стракатая Сойка» (казка), «Лістапад».

*Р. Ігнаценка*. «Лістападнічак».

Пазакласнае чытанне. *А. Якімовіч*. «Вось дык суседзі!» (казка) (*Н. Маеўская*. «Самасейка» (казка))[8].

[8] Педагагічны работнік можа прапанаваць вучням іншыя творы для пазакласнага чытання.

Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*Васіль Вітка, М. Пазнякоў, А. Хітрун, У. Мацвеенка, У. Паўлаў, В. Жуковіч* і інш.).

**3. О, край родны, край прыгожы! (14 гадзін)**

*Я. Сіпакоў*. «Наш край».

*П. Броўка*. «Беларусь».

*А. Дзеружынскі*. «Я спяваю, ты спявай!».

*П. Броўка*. «Радзіма».

*Эдзі Агняцвет*. «Зямля з блакітнымі вачамі».

*М. Пазнякоў*. «Мы – беларусы».

*З. Бандарына*. «Дарагі падарунак» (з жыцця Янкі Купалы).

*С. Александровіч*. «У грыбах» (з дзяцінства Якуба Коласа).

*Якуб Колас*. «Успамін».

*В. Вольскі*. «Буслы».

*К. Жук*. «Хто такі?».

*В. Шніп*. «Белая чапля».

*А. Вярцінскі*. «Што такое Радзіма?».

*Я. Крамко*. «З Міра ў Карэлічы».

*У. Ліпскі*. «Дуб і яго сяброўкі».

*В. Хомчанка*. «Тры каскі».

Пазакласнае чытанне. *М. Пазнякоў.* «Родная мова». (*І. Сідарук.* «Лясны трамвай» (казка)).

Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*К. Жук, Г. Аўласенка, Л. Шырын, С. Бестава, Я. Рызнік, Міхась Сліва, В. Жуковіч, У. Мацвеенка, Васіль Вітка* і інш.).

**4. Стала ўсюды бела-бела – і зямля папрыгажэла (11 гадзін)**

*К. Жук.* «Снежань».

*С. Шушкевіч.* «Зазімак».

*Клаўдзія Каліна.* «Снежань», «У студзеньскую ноч», «Лыжы».

*С. Бестава.* «Зайку жыць смялей».

*У. Мацвеенка.* «Зімовыя загадкі».

*Я. Галубовіч.* «Андрэйка-памочнік», «Як вавёрачка зіму сустракала» (казка).

*А. Пісьмянкоў.* «Запаслівая вавёрка».

*Т. Мушынская.* «Зімовыя забавы».

*М. Чарняўскі.* Елачка.

*М. Шаховіч.* «Алесева ёлка».

*У. Карызна.* «Гуканне Дзеда Мароза».

*У. Мазго.* «Новы год».

Пазакласнае чытанне. «Два маразы» (беларуская народная казка *(у апрацоўцы Якуба Коласа)*).

Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*Васіль Вітка, М. Пазнякоў, В. Жуковіч, У. Мацвеенка, У. Карызна, А. Хітрун, Л. Шырын, Я. Рызнік* і інш.).

**5. І рады мы вясёлым забаўкам зімы (9 гадзін)**

*С. Новік-Пяюн.* «Зіма».

*М. Чарняўскі.* «Завіруха».

*Якуб Колас.* «На рэчцы зімою».

*Янка Журба.* «У школу».

*Клаўдзія Каліна.* «Калючы госць».

*М. Пазнякоў.* «Верш-задачка».

*І. Аношка.* «Знічка».

*Я. Галубовіч.* «Не пабаяліся марозу».

*В. Вольскі.* «Крыжадзюб».

*Г. Аўласенка.* «Хто як зімуе?».

*Я. Галубовіч.* «Цецерукі ў снезе».

*В. Жуковіч.* «Мядзведзеў сон».

*П. Панчанка.* «Студзень – з казкамі снежных аблокаў…».

Пазакласнае чытанне. *М. Пазнякоў.* «Зімовыя птушкі» (*Р. Ігнаценка.* «Каму холадна, каму душна»).

Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*У. Паўлаў, М. Пазнякоў, У. Мацвеенка, С. Шах, Л. Шырын, Міхась Сліва, В. Жуковіч, Васіль Вітка* і інш.).

**6. Расці сапраўдным чалавекам (10 гадзін)**

*М. Дукса.* «Сябры».

*Васіль Вітка.* «Дзень нараджэння».

*А. Пысін.* «Імяніны».

*І. Муравейка.* «Стол».

*В. Ткачоў.* «Канфуз».

*А. Якімовіч.* «Каб не сварыліся».

*Р. Дамброўская.* «Хлопчык і крынічка».

*Янка Купала.* «Хлопчык і лётчык».

*А. Капусцін.* «На Партызанскім востраве».

*Н. Галіноўская.* «Дзякуй, чалавек!».

Пазакласнае чытанне. *Я. Галубовіч.* «Зайка і яго сябры» (казка).

Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*А. Клышка, Н. Гілевіч, Л. Шырын, Я. Рызнік, В. Жуковіч, У. Мацвеенка, Васіль Вітка, Н. Парукаў* і інш.).

**7. Толькі вось была б ахвота, ёсць рукам заўжды работа (8 гадзін)**

*А. Астрэйка*. «Размова аб прафесіях».

*М. Даніленка*. «Заяц Доўгае Вуха».

*Р. Бензярук*. «Птах на будоўлі».

*Міхась Сліва*. «Два клёнікі».

*П. Прануза*. «Ах, як хораша на сэрцы…».

*Н. Маеўская*. «Чырвоны матаролер».

*М. Чарняўскі*. «Тату я дапамагаю».

*Я. Бяганская*. «Каму сказаць «дзякуй?»».

*Васіль Вітка*. «Хто што робіць?».

Пазакласнае чытанне. *Я. Галубовіч*. «Лежабока гарнастай» (казка), (*М. Даніленка*. «Трэба»).

Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*В. Жуковіч, Васіль Вітка, М. Чарняўскі, У. Мацвеенка, Я. Рызнік* і інш.).

**8. Штогод у вызначаны час вясна спяшаецца да нас! (13 гадзін)**

*Якуб Колас*. «Уцякай, мароз-дзядуля!..».

*А. Асіпенка*. «Як вясна зіму прагнала».

*М. Смагаровіч*. «Прадвесне».

*Г. Аўласенка*. «Пралеска».

*П. Прануза*. «З крышталёвым бляскам…».

*У. Мазго*. «Шпакі», «Жаўрук».

*У. Дубоўка*. «Дзядуля размаўляе з бацянамі».

*А. Вольскі*. «Свята вясны».

*Ю. Свірка*. «Свята».

*Эдзі Агняцвет*. «Маме».

*Канстанцыя Буйло*. «Градка».

*Д. Слаўковіч*. «Расці, бульбачка».

*А. Дудараў*. «Буслы».

*С. Шушкевіч*. «Кветкамі сады асыпаў май».

*І. Муравейка*. «Праўнук Перамогі».

*А. Якімовіч*. «Дапамога».

*А. Бачыла*. «Ціха сосны шумяць».

*М. Пазнякоў*. «Садзім алею».

Пазакласнае чытанне. *А. Масла*. «Зорная казка» (*П. Кавалёў*. «Божая кароўка», *М. Даніленка*. «Салодкая цыбуля»).

Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*А. Клышка, В. Кудлачоў, В. Шніп, Я. Рызнік, Міхась Сліва, В. Жуковіч, У. Мацвеенка, Васіль Вітка* і інш.).

**9. Лета-лецейка гарачае ясным сонейкам нас радуе (14 гадзін)**

*Г. Бураўкін*. «Добра ўсім жывецца ўлетку…».

*К. Жук*. «Лета выспела якое!».

*А. Капусцін*. «Цвёрдае слова».

*М. Ліпская*. «Люблю я родную прыроду…».

*А. Жук*. «Чырвонагаловікі».

*Міхась Сліва*. «Суніцы».

*Клаўдзія Каліна*. «Ліпень».

*М. Гамолка*. «У грыбах».

*Р. Ігнаценка*. «Сухое лета», «Незвычайны грыбнік», «Вёрткія язі».

*Я. Галубовіч*. «Хто рукавічку згубіў?», «Птушыная кладачка».

*В. Хомчанка*. «Музыка ў бары».

*К. Камейша*. «Не спяшайся, лета».

*У. Ягоўдзік*. «Жмені ягад» («Суніцы»).

Пазакласнае чытанне. *Клаўдзія Каліна*. «Жнівень» (*Л. Глушко*. «Сунічкі»).

Прыказкі, прыкметы, смяшынкі, лічылкі, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, у тым ліку аўтарскія (*А. Зэкаў, У. Мацвеенка, Т. Кляшторная, К. Жук, Я. Рызнік, В. Жуковіч, Васіль Вітка* і інш.).

## ЧЫТАННЕ

**Спосаб чытання.** Чытанне цэлымі словамі ўслых. Паскладовае чытанне незнаёмых і цяжкіх для вымаўлення слоў складанай структуры. Выпрацоўка навыку чытання сам сабе.

**Правільнае чытанне.** Правільнае арфаэпічнае чытанне без скажэння гукавога складу слова простага па змесце і невялікага па аб'ёме знаёмага і незнаёмага тэксту. Пастаноўка правільнага націску. Арфаэпічна правільнае і ўсвядомленае чытанне сам сабе.

**Свядомае чытанне.** Усведамленне зместу твора з нескладаным сюжэтам (разуменне пра каго або пра што гаворыцца; паслядоўнасць падзей, характары герояў, ацэнка іх учынкаў). Падмацаванне сваёй думкі словамі з тэксту.

Аналіз назвы твора. Вызначэнне тэмы тэксту. Тлумачэнне слоў і выразаў з выкарыстаннем нагляднасці і слоўніка да тэксту. Выбарачны пераказ (блізкі да тэксту, з выкарыстаннем аўтарскіх слоў і выразаў). Узнаўленне парушанага парадку частак тэксту (дэфармаваны тэкст).

Суаднясенне малюнка з урыўкам з твора.

Пераход да падрабязнага пераказу. Устанаўленне паслядоўнасці падзей: што было спачатку, потым, напрыканцы, чым скончылася.

Вывады па прачытаным тэксце з апорай на ўласны вопыт навучэнцаў, на змест раней прачытанага тэксту. Складанне апавядання па малюнку (серыі малюнкаў). Эмацыянальная ацэнка тэксту.

**Выразнае чытанне.** Плаўнае чытанне з улікам знакаў прыпынку (кропка, коска, пытальнік, клічнік). Чытанне са змяненнем сілы голасу і тэмпу.

Выразнае чытанне на памяць (вершаў, загадак, лічылак, скорагаворак і інш.), па асобах.

Хуткасць чытання павялічваецца ў адпаведнасці з індывідуальнымі магчымасцямі навучэнцаў.

## ЧЫТАЦКІЯ ЎМЕННІ

Навучэнцы авалодваюць наступнымі ўменнямі:

свядома і арфаэпічна правільна чытаць цэлымі словамі ўслых з захаваннем правільнага націску, адпаведнай інтанацыі, паўз;

свядома чытаць сам сабе;

пераказваць прачытанае і адказваць на пытанні сваімі словамі і сказамі, урыўкамі з тэксту;

дзяліць тэкст на часткі, даваць ім назву;

падрабязна пераказваць прачытанае з дапамогай педагагічнага работніка, апорных слоў, ілюстрацый;

даваць эмацыянальную ацэнку героям, іх учынкам і паводзінам;

знаходзіць апісанні героя, прыроды.

## ПАЗАКЛАСНАЕ ЧЫТАННЕ

Чытанне ілюстраваных кніг беларускіх пісьменнікаў, часопісаў для дзяцей. Арыентацыя ў назве кнігі, часопіса. Пошук пэўнага твора, тэксту па змесце. Запіс назвы і аўтара кнігі ва ўліковы лісток самастойна прачытаных кніг. Чытанне-разглядванне часопісаў для дзяцей.

Замацаванне правілаў гігіены чытання і беражлівага стаўлення да кніг.

Навучэнцы працягваюць вучыцца выбіраць знаёмую кнігу сярод іншых па інструкцыі педагагічнага работніка. Чытаюць кнігу ці асобны твор услых самастойна, вызначаюць, пра што (каго) пойдзе размова ў кнізе (творы) па назве, ілюстрацыях.

**Кола чытання.** Ілюстраваныя дзіцячыя кнігі з тыповым афармленнем вокладкі (прыкладна 16–24 старонкі), часопісы для дзяцей («Вясёлка», «Буся», «Бярозка» і інш.).

**Тэматыка чытання** суадносіцца з тэматыкай урокаў літаратурнага чытання і можа пашырацца тэкстамі пра Радзіму, яе гісторыю, выбітных дзеячаў нашай краіны, пра сяброўства і ўзаемаадносіны ў сям’і, павагу, клопат і ўдзячнасць, якія павінны быць паміж людзьмі, пра прыроду і ролю чалавека ў яе ахове.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

*Навучэнцы ведаюць і разумеюць:*

дзіцячыя перыядычныя выданні («Вясёлка», «Буся», «Бярозка» і інш.);

сродкі выразнага чытання (лагічны націск, паўза, тэмп);

на памяць 5-6 кароткіх вершаў (загадкі, лічылкі і інш.);

правілы гігіены чытання і неабходнасць беражліва ставіцца да кніг.

*Навучэнцы ўмеюць:*

правільна і асэнсавана чытаць (цэлымі словамі ўголас і сам сабе, цяжкія па структуры словы – па складах);

арыентавацца ў кнізе: знаходзіць назву, прозвішча аўтара, патрэбную старонку;

устанаўліваць паслядоўнасць падзей у творы і ўзнаўляць парушаны парадак частак тэксту;

вызначаць герояў твора, характарызаваць іх, карыстаючыся сказамі і ўрыўкамі з тэксту, даваць ацэнку;

выказваць уласныя адносіны да падзей, з’яў і ўчынкаў герояў;

выразна чытаць на памяць перад класам (з захаваннем паўз і інтанацыі сказа);

вылучаць эпізод з тэксту, дзяліць тэкст на часткі, складаць план, пераказваць падрабязна і выбарачна з дапамогай педагагічнага работніка;

знаходзіць апісанні героя ці прыроды;

адрозніваць загадку, скорагаворку, казку;

самастойна ці з дапамогай бібліятэкара знаходзіць у школьнай бібліятэцы кнігі для пазакласнага чытання.

*Навучэнцы выкарыстоўваюць набытыя веды і ўменні ў штодзённых зносінах і практычнай дзейнасці:*

падтрымліваюць размову на зразумелую тэму, правільна вымаўляючы гукі роднай мовы (4–5сказаў);

расказваюць пра падзеі з уласнага жыцця (4–5 сказаў);

самастойна чытаюць друкаваны і пісьмовы тэкст інфармацыйнага характару (расклад урокаў, аб’ява, паведамленне, запіска);

самастойна падпісваюць друкаванымі ці рукапіснымі літарамі сваю работу (малюнак, аплікацыя);

інтанацыйна афармляюць размову і вядуць яе з захаваннем этыкі суразмоўніцтва.